РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Святлана Кананович*

## АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ НАВУКОВАГА ВЫВУЧЭННЯ І ФІКСАЦЫІ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Шматграннасць і універсальнасць беларускай культурнай прасторы ў той ці іншай ступені ўвасоблена ў экспазіцыйна-выставачнай, навукова-фондавай рабоце айчынных музеяў. Своеасаблівай формай спасціжэння гісторыі нашага краю з'яўляюцца апрадмечаныя ў музейным асяродку перапетыі мінулых стагоддзяў у вобразах гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

На сённяшні дзень музеі Беларусі ў меншай ступені ўяўляюцца ўстановамі з прыналежнай ім атрыбутыкай. Сённяшні музей – гэта хутчэй сацыякультурнае асяроддзе, сфера ўздзеяння якога значна пашырылася. У сваім памкненні сфарміраваць у наведвальніка адносіны не толькі да гісторыі свайго краю, але і дапамагчы чалавеку ў выяўленні пэўнай грамадскай пазіцыі ў дачыненні да культурнай спадчыны, музеі Беларусі паступова самі становяцца генератарамі і транслятарамі культурнай матрыцы нашай краіны. Аб гэтым і сведчыць той факт, што музеі на чарзе з астатнімі культурнымі інстытутамі ўзялі сабе на ўзбраенне сусветную тэндэнцыю ў галіне навуковага вывучэння і трансляцыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

У якасці самастойнага аб'екта даследавання нематэрыяльная культурная спадчына пачала выдзяляцца прыкладна ў апошняе дзесяцігоддзе. Менавіта ў 1997 годзе, па нашым меркаванні, быў

адлічаны час, калі ў навуковым свеце пачалі актыўна выкарыстоўваць дэфініцыю «нематэрыяльная культурная спадчына» (Intangible Heritage), якая ўяўляла сабой тоеснае паняцце з фармуліроўкай «вусная нематэрыяльная спадчына чалавецтва» (Oral and Intangible Heritage of Humanity), што была далучана да сферы дзейнасці «Канвенцыі па ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны» [1, с. 156].

Менавіта з гэтага часу і па сённяшнія дні ў навуковым свеце, як адзначана ў Першым «Дакладзе ЮНЭСКА аб культуры свету» [1], вядзецца палеміка адносна таго, ці дастаткова правамерна падзяляць культуру на матэрыяльную і нематэрыяльную. Бо нярэдка мяжа паміж імі і сапраўды дастаткова ўмоўная. Гэта дзве сферы ў жыцці і творчасці чалавека вельмі рухомыя і нярэдка пераходзяць адна ў другую. З часу прыняцця «Канвенцыі па ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны чалавецтва», калі была далучана і «... вусная нематэрыяльная культурная спадчына чалавецтва» [1, с. 153], тэарэтыкі і практыкі праблем культуры паступова бяруць ва ўжытак і актыўнае выкарыстанне ў навуковай лексіцы дэфініцыю «нематэрыяльная культурная спадчына».

Першы «Даклад ЮНЭСКА аб культуры свету» [1], выдадзены ў 1998 годзе, вылучыў праблему захавання культурнай разнастайнасці. Экспертамі Цэнтра сусветнай спадчыны было заўважана, што з каласальнай хуткасцю знікаюць сляды тысячагадовых традыцый, моў, жыццёвых укладаў. Пад пагрозай апынулася большасць з форм: мастацтва вуснай традыцыі, традыцыйная і народная музыка, танец, рамесніцтва, мясцовыя дыялекты і гаворкі, словам, усё тое, што вылучае беларускую нацыю сярод астатніх.

Як і большасць краін свету, у Беларусі на працягу многіх гадоў характэрнай асаблівасцю развіцця культуры з'яўлялася падмена каранёвай аўтэнтычнай нацыянальнай культуры масавай культурай.

Таму, безумоўна, можна зрабіць выснову, што для нашай краіны праблема вывучэння і навуковай фіксацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны з'яўляецца надзвычай актуальнай.

Для рашэння пастаўленых задач былі задзейнічаны сілы вядучых культурна-асветных і навукова-даследчых устаноў, сярод якіх музеі могуць і павінны заняць вядучую пазіцыю. Што абгрунтавана найперш зменай поглядаў сусветнай музеязнаўчай супольнасці на прадмет і азначэнне музеязнаўства. Пастулова перад тэарэтыкамі і практыкамі музейнай справы паўстала праблема тэарэтычнага асмыслення працэсу пераутварэння асновы дзейнасці музеяў – помнікаў культуры – з рухомых у нерухомыя, з матэрыяльных у нематэрыяльныя.

Музей сёння – гэта тая ўстанова, якая апроч асноўных сваіх функцый выконвае і ролю носьбіта сацыяльнай памяці. У калекцыях артэфактаў, якія захоўваюцца ў музеях, адлюстраваны цэласны самабытны культурны пласт беларускай нацыі [4]. Задача музея сёння – рэпрэзентаваць яго ўсімі магчымымі музейнымі сродкамі, забяспечыць якасную і паўнацэнную фіксацыю і выкарыстанне не толькі ў музейнай дзейнасці, аднак і ў іншых галінах.

Прыкладаў паспяховага вырашэння пастаўленых задач не шмат, аднак гэта пытанне хутчэй датычыць непаўнаты сабраных звестак аб вывучэнні гэтай праблемы. Так да прыкладу, у Віцебскім абласным краязнаўчым музеі навуковымі супрацоўнікамі ўсвядомлена як факт неабходнасць стварэння такой своеасаблівай музейнай прасторы, якая б спрыяла найбольш якаснай і яскравай рэпрэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Што ў першую чаргу патрабуе збору, фіксацыі і вывучэння нематэрыяльнай культурнай спадчыны Віцебшчыны. Як сведчыць вопыт, патрэба ў наведвальніка ў такім новаўтварэнні існуе. Людзям як правіла цікава даведацца не толькі аб гісторыі свайго краю, але і аб тых звычаях і традыцыях, якія давяршаюць напоўненасць гістарычных падзей Віцебшчыны, складаюць матрыцу яе рэпрэзентатыўнасці не толькі сярод астатніх рэгіёнаў Беларусі, але і вылучаюць яе адметнасць на міжнароднай культурнай прасторы.

Навуковая канцэпцыя такой выставы, па словах супрацоўніка Віцебскага абласнога краязнаўчага музея А.В. Катовіч, хаця яшчэ і знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі, унікальная сваей навізной і вялікім культуралагічным патэнцыялам. Па меркаванні супрацоўнікаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, сёння ў недастатковай ступені вывучана і паказана наведвальнікам тое, што сабрана супрацоўнікамі музеяў падчас экспедыцый у рэгіёны. Значны пласт здабыткаў традыцыйнай культуры Беларусі «не ўзняты на паверхню» з прычыны адсутнасці не толькі належнага фінансавання, але і пэўнай сістэмы музейнай дзейнасці, якая б дазволіла наладзіць супрацоўніцтва буйных музейных устаноў з музеямі рэгіянальнага ўзроўню па адборы аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў асяродку бытавання і пастаноўцы на ўлік праз фіксацыю на мэтэрыяльных носьбітах скрытых атрыбутыўных якасцяў аб'екта культуры, якія складаюць культурную матрыцу традыцыі. Уключэнне ў фонды музея і далейшае выкарыстанне сапраўдных музейных прадметаў – рэчыўных, выяўленчых, фона- і фотакрыніц дасць магчымасць уключыць у музейную прастору «музеефіцыруемую нематэрыяльную форму» [3, с. 63].

Як бачна, гэтая праблема даволі істотная і патрабуе неадкладнага вырашэння. На сённяшні дзень сусветная музейная супольнасць прыняла да ўвагі меркаванне, што ўсе аб'екты культурнай спадчыны могуць быць музеефікаваныя, у тым ліку і нематэрыяльныя. Падставай для гэтага паслужыў той факт, што ў 1990 годзе было вызначана кола нематэрыяльных форм культуры, якія паступова набылі статус музейных аб'ектаў, і з'явілася магчымасць іх класіфікацыі [2, с. 130].

Асновай такой класіфікацыі сталі структурныя элементы культуры, якія ў сваю чаргу далі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчымасць вылучыць асноўныя тыпы музеефікуемых аб'ектаў: духоўная культура (музыка, танец, фальклор і г.д.); тэхналогіі і вытворчыя працэсы (у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, народнай прамысловасці, рамёствах і г.д.); традыцыйныя дзеянні, абрады, звычаі, традыцыйныя ўяўленні і інш.

У Беларусі вырашэнне праблемы захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны музейнымі сродкамі «скранулася з мёртвай кропкі», але не можа набраць «патрэбных абаротаў». І прычына, на нашу думку, крыецца не толькі ў адсутнасці належнага фінансавання. Справа ў тым, што для нашай краіны само па сабе музеязнаўства з'яўляецца «маладой» навукай. А калі размова заходзіць аб тым, каб прызнаць музейным прадметам аб'ект нематэрыяльнай культурнай спадчыны, увогуле ўзнікае шмат спрэчных пытанняў.

З аднаго боку, прыхільнікі працэсу музеефікацыі аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны бачаць яго не толькі магчымым, як кажуць, «тэхнічна», але і падчас адзінай мерай, здольнай захаваць традыцыю.

Тыя ж, хто знаходзіцца ў апазіцыі гэтага падыходу, лічаць такое захаванне другаснай формай. Такая своеасаблівая «копія копій» па іх меркаванні парушае каштоўнасную дамінанту нематэрыяльнай культурнай спадчыны – аўтэнтычнасць – альбо цалкам знішчае яе. Не выключна, такое меркаванне не пазбаўлена сэнсу. Аднак, якім чынам усё ж магчыма захоўваць тую ці іншую форму нематэрыяльнай культурнай спадчыны, калі сувязь яе з носьбітам і тым, хто мог бы пераняць гэтую форму, з шэрагу акалічнасцяў перарвалася – страціць назаўсёды?

Адсюль напрошваецца выснова: дакументаваннем аб'ктаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС) усё ж варта займацца. Аднак зафіксаваная форма НКС на адным з матэрыяльных носьбітаў, хаця і атрымае магчымасць захоўвацца ў музеі неабмежавана доўга, усё ж страціць сваю каштоўнасць, калі не будзе прадстаўлена гледачу. Шляхам жа музейнага мадэлявання той рэчаіснасці, дзе пэўная з'ява НКС атрымала б другое жыццё, магчыма рэпрэзентаваць у экспазіцыі музея аб'екты НКС. Толькі праз бесперапынную актуалізацыю зафіксаванага і захаванага ў фондах матэрыялу – своеасаблівай мадэлі той ці іншай з'явы традыцыйнай культуры (да прыкладу – апісанне мадэлі вырабу традыцыйнага касцюма), магчыма паўнацэннае, якаснае захаванне і трансляцыя НКС у музеі.

Такім чынам, на шляху захавання найбагацейшай культурнай спадчыны беларускага народа музеі здольныя не толькі зберагчы ў сваіх фондах дакументальна засведчаныя аб'екты НКС, але і зрабіць успрыманне і «прачытанне» наведвальнікамі (у больш шырокім сэнсе – новымі пакаленнямі) кодаў традыцыйнай культуры больш дасціпным і ўсебаковым.

Спіс літаратуры:

1. Всемирный доклад по культуре, 1998: Культура, творчество, рынок : пер. на рус. яз. / ЮНЕСКО. – М. : Ладомир, 2001. – 480 с.
2. Гнедовский, М.Б. Музейная коммуникация и музейный сценарий / М.Б.Гнедовский // Музей и современность : сб. науч. тр. – М., 1986. – С. 127–133.
3. Основы музееведения : учеб. пособие для высш. учеб. завед. по спец. «Музейное дело и охрана памятников» / отв.ред. Э.А. Шулепова ; Рос. ин-т культуралогии. – Москва : Едиториал УРСС, 2005. – 501с.
4. Рэкамендацыі па ахове, захаванні, пераемнасці і папулярызацыі беларускага аўтэнтычнага фальклору // Аперагыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. – Мінск, 2001. – 12 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ